# У Гродне стартавала алімпіяда

9 студзеня 2017 года ў Гродна ў чарговы раз распачаў працу ІІІ абласны тур алімпіяды па беларускай мове і літаратуры. З розных раёнаў вобласці з'ехаліся школьнікі, якія паспяхова прайшлі два папярэднія туры. На новым этапе не толькі праводзілася спаборніцтва паміж мацнейшымі, адбываўся адмысловы адбор тых, хто будзе абараняць гонар вобласці на IV рэспубліканскім туры алімпіяды. Цэлы тыдзень школьнікі 9, 10, 11 класаў удзельнічалі ў конкурсе водгукаў, вусных выказванняў, выконвалі комплексную работу па мове і літаратуры. Працу юных алімпіёнікаў ацэньвала кампетэнтнае журы, у склад якога былі ўключаны настаўнікі і выкладчыкі розных навучальных устаноў Гродзеншчыны. Па даўняй традыцыі ў склад журы ўвайшлі выкладчыкі філалагічнага факультэта, члены Гродзенскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі: Руцкая А. В., Тарасава С.М. Па іх сведчанні, у розных алімпіядных конкурсах школьнікі не толькі паказалі любоў да роднага слова, але і выявілі свой выключна высокі творчы патэнцыял. У водгуках і вусных выказваннях навучэнцаў гучалі вершы беларускіх паэтаў, пісьменнікаў з Гродзеншчыны, дэманстраваліся ўласныя паэтычныя спробы.

13 студзеня ў актавай зале Гродзенскага электратэхнічнага каледжа адбылося закрыццё алімпіяды і ўрачыстае ўзнагароджанне пераможцаў. З 70 удзельнікаў прызёрамі сталі 33 вучні, якія паказалі найлепшыя вынікі і набралі найбольшую колькасць балаў. Гродзенскае аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі адзначыла найбольш яркіх выступоўцаў, чыя праца ўразіла яркасцю і творчай неардынарнасцю. Прадстаўнікам кожнага класа былі ўручаны адпаведныя падарункі.

Сярод удзельнікаў, кіраўнікоў каманд, членаў журы, арганізатараў панавала дзелавая, і ў той жа час вельмі творчая і прыязная атмасфера.

**Святлана ТАРАСАВА,**
член СПБ,
старшы выкладчык
кафедры беларускай літаратуры
ГрДУ імя Я.Купалы

*Фота 1-2 - рабочыя моманты алімпіяды.*
*Фота 3 – пераможцы Кастрычніцкага р-на г.Гродна, якіх рыхтавалі да алімпіяды выкладчыкі філалагічнага факультэта.*
*Фота 4 – каманда школьнікаў Гродзенскай вобласці, якая будзе прымаць удзел у IV рэспубліканскім туры алімпіяды па беларускай мове і літаратуры.*

*Фота аўтара.*







